ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
16 01 2014 г.

## УВАГА, АЎТАРЫ!

*Другі месяц запар «Чырвонка» друкуе на сваіх старонках творчыя работы маладых няштатных аўтараў, якія паступілі на конкурс «Мы — такія!..» Усяго на сёння ў рэдакцыю дасланa ўжо каля паўсотні такіх «проб пяра» і, думаецца, гэта яшчэ далёка не ўсё. Нам пішуць з самых розных куточкаў краіны, дасылаюць матэрыялы розных жанраў... Думаем, і чытачы ўжо паспелі заўважыць, што многія работы па-сапраўднаму цікавыя.*

*Таму чарговы раз хацелася б звярнуцца да нашых маладых аўтараў і нагадаць ім, што на старонках «Чырвонкі» будуць надрукаваны ЛЕПШЫЯ творчыя працы з дасланых. Матэрыялы да ўдзелу ў ім прымаюцца ТОЛЬКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ПАВІННЫ АДПАВЯДАЦЬ УМОВАМ КОНКУРСУ. Больш падрабязна азнаёміцца з імі можна ў нумарах ад 26 верасня і 31 кастрычніка мінулага года або на сайце газеты.*

*Тым не менш мусім яшчэ раз коратка нагадаць, што тэксты трэба дасылаць (калі гаворка ідзе пра электронную пошту) у фармаце RTF. КОЖНАЯ ілюстрацыя ці фотаздымак дасылаецца АСОБНЫМ ПРЫМАЦАВАНЫМ ФАЙЛАМ. Калі ласка, не трэба завёрстваць здымкі ў тэкст, як гэта робіцца пры афармленні школьных рэфератаў ці насценнай газеты!*

*І яшчэ. Не забывайцеся пазначаць ХАТНІ АДРАС (з паштовым індэксам), КАНТАКТНЫЯ НУМАРЫ ТЭЛЕФОНАЎ і ПАШПАРТНЫЯ ЗВЕСТКІ АЎТАРАЎ (кім і калі быў выдадзены пашпарт, нумар, асабісты нумар, імя, імя па бацьку, прозвішча). ТОЛЬКІ пашпартныя звесткі павінны быць НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ. Калі ў дзіцяці яшчэ няма пашпарта (пасведчанне аб нараджэнні не падыходзіць), дасылаюцца поўныя пашпартныя звесткі АДНАГО З БАЦЬКОЎ.*

# «ХВІЛІНА СЛАВЫ» ЗАПАЛЬВАЕ ШКОЛЬНЫЯ «ЗОРКІ»

**Школьнае жыццё — непаўторны, цікавы час: урокі, сябры, справы і мары. Але запамінаюцца самыя адметныя моманты, тыя, калі адчуваеш сябе «зоркай» на школьным «небасхіле», калі раптам цябе заўважае ўся школа.**

Даць магчымасць адчуць сябе такой «зорачкай», зрабіць суботні школьны дзень насычаным і асаблівым — такой была мэта агульнашкольнага агляду-конкурсу «Хвіліна славы», які прайшоў у нашай сярэдняй школе № 4.

Дзве суботы запар таленавітыя і актыўныя вучні з першага па адзінаццаты клас дэманстравалі свае здольнасці ў чатырох намінацыях: харэаграфія, музычны жанр, мастацкая творчасць, арыгінальны жанр. У перапоўненай зале сабраліся вучні, класныя кіраўнікі, бацькі — усе падтрымлівалі сваіх прадстаўнікоў! Ніхто не застаўся абыякавым: хвалявaліся і дапамагалі, засмучаліся і радаваліся.

Журы пад кіраўніцтвам дырэктара школы Антаніны Яўгенаўны Мазуры было прыемна ўражана цікавымі і разнастайнымі выступленнямі. Найбольш канкурсантаў выбралі вакальны жанр: тут і песні на роднай мове, і сучасныя кампазіцыі, і выступленні па-англійску. Запамінальнымі былі нумары Вікторыі Майніч, Дар'і Ждан, Юліі Пятровай, Вольгі Качан, Валерыі Бобіч, Паліны Брыкман, Паліны Гаўраш.

Кожны марыў здзівіць, таму склaліся дуэты, гучалі песні пад акампанемент гітары, а Вераніка Пучыла ўдзельнічала разам з мамай, выканаўшы ў суправаджэнні акардэона п'есу на цымбалах. Пасучаснаму гучала нават балалайка Паўла Ківача ў час выканання «Карабейнікаў».

Па-майстэрску і натхнёна выступілі танцавальная група 6 «А» класа з танцам «Бліскучы рок-н-рол», групы «Тандэм» 7 «А» і 9 «А» класаў з нумарамі «Крок наперад» і «Rolling in the deep» (кіраўнік Родзька Т.Н.). І, вядома, гучалі вершы: узнёсла, пранікнёна і ад усяго сэрца. Але найбольш уразіла вучаніца 9 «А» класа Вераніка Танкевіч — уся зала не магла стрымаць слёз, слухаючы верш «Не раз уже в заштопанном халате».

**Хто б мог падумаць, што ўзбітыя вяршкі, кіпень і шакалад стануць інструментамі для стварэння мастацкага нумара!**

Самым арыгінальным нумарам стаў незвычайны майстар-клас «Кава-хаўс», падрыхтаваны Іванам Ходарам і Аляксандрам Сіневічам з 7 «Б» класа. Хто б мог падумаць, што ўзбітыя вяршкі, кіпень і шакалад стануць інструментамі для стварэння мастацкага нумара! А дабаўце да гэтага цудоўны пах кавы... Пасля выступлення гледачы не толькі гучна апладзіравалі, але і змаглі паспытаць шэдэўр «кававага мастацтва».

А юныя ўдзельнікі, вучні пачатковых класаў, як сапраўдныя артысты дэманстравалі ўдалае спалучэнне творчасці і мэтанакіраванасці. Многія прыгожа і эмацыянальна танцуюць, выдатна чытаюць вершы, хораша спяваюць. Журы адзначыла выступленні Карыны Аліевіч, Карыны Качан, Дзіяны Каратай, Ангеліны Навашыцкай, Генадзя Макоўскага, Яўгеніі Краскоўскай, вакальных груп 4 «Б», 4 «В»,3 «В» і 1 «Б» класаў. Некаторыя ўжо вельмі добра валодаюць музычнымі інструментамі: вучань 3 «Б» класа Роберт Гулевіч — саксафонам, вучань 4 «В» Міхаіл Каравай — валторнай, вучаніца 3 «В» Марыя Семянчук — скрыпкай.

Конкурс стаў яскравай і адметнай з'явай, якая аб'яднала дзяцей і дарослых. Школа, напоўненая натхненнем і ідэямі, рыхтуецца да фіналу, які пройдзе ў лютым і будзе прымеркаваны да Дня абаронцаў Айчыны. І не важна, хто стане пераможцам, бо галоўнае ўжо здзейснена — новыя «зорачкі» засвяцiліся. Поспехаў вам, юныя артысты!

**Вадзім ГАЛУШКА,**
**вучань 8 класа СШ № 4**
**г. Навагрудка.**

### ПРА АЎТАРА

— Маё галоўнае захапленне — журналістыка, — кажа пра сябе 14-гадовы аўтар. — Вельмі люблю вандраваць, знаёміцца з новымі людзьмі, вывучаць невядомае. Я адкрыты і таварыскі, таму ў мяне шмат сяброў і аднадумцаў. Акрамя журналістыкі, займаюся каратэ, актыўна ўдзельнічаю ў жыцці сваёй школы. У будучыні хачу звязаць сваё жыццё з журналістыкай і працаваць карэспандэнтам або тэлерадыёвядучым. Лічу, што гэта вельмі цікавая і сучасная прафесія, яна дапамагае чалавеку адкрываць свет.

Вадзім уваходзіць у аб'яднанне юных журналістаў СШ №4 пад кіраўніцтвам настаўніцы Алены Іосіфаўны Пятровай. Вось што кажа яна: «З цікавасцю даведаліся пра конкурс «Мы — такія!..» і вырашылі прыняць удзел. Наша школа — адна са старэйшых у горадзе. Вучыцца ў ёй цікава, бо школьнае жыццё ніколі не стаіць на месцы: святы, конкурсы, сустрэчы, экскурсіі і шмат іншага. Хочацца расказаць пра гэта, каб усе ведалі, якія яны — сённяшнія вучні. Дасылаем вам рэпартаж з конкурсу «Хвіліна славы» вучня Вадзіма Галушкі».

# ВЕРЫ І ДАБРЫНІ НАШЫМ СЭРЦАМ

**Мітрапаліт Ніжагародскі і Арзамаскі Георгій, ураджэнец Жлобіна, калісьці вучыўся ў сярэдняй школе № 6, у якой сёння вучуся я. Пры асабістай сустрэчы з уладыкам я задала некалькі пытанняў.**

***— Васіль Цімафеевіч*** *(свецкае імя суразмоўцы. —* **Аўт.***),* ***раскажыце, калі ласка, пра сваю сям'ю.***

— У сям'і перш за ўсё на цябе вялікі ўплыў аказваюць старэйшыя браты і сёстры. Бацькі — гэта «свая» тэма выхавання, а вось калі ты расцеш, дзе хтосьці за цябе не нашмат старэйшы, хтосьці маладзейшы... Я быў апошні ў сям'і, самы любімы. Ды ўсе слухалі бацькоў. На нас накладаліся нейкія абавязкі па гаспадарцы, мы іх выконвалі.

***— Што цікавіла вас найперш у школьныя гады?***

— Ваенная тэма. Яна для мяне заўсёды была блізкая — і ў дзяцінстве, і ў юнацтве. І, можа быць, я не маю ўжо такой магчымасці чытаць літаратуру, але заўсёды, калі думкі вяртаюцца да ваеннай эпохі, калі бачу ветэранаў, то адчуваю нейкае асаблівае духоўнае трапятанне, глыбокую павагу. Я нарадзіўся ў тым асяроддзі, памятаю тых людзей, таму тэма подзвігу, самаадданасці, служэння — галоўныя для мяне. Я нарадзіўся на беразе Дняпра, там стаяў фронт больш за дзесяць месяцаў, там бліндажы, акопы... Калі мы бачылі чалавека ў пагонах, мы яго абагаўлялі. Таму тэма абароны Радзімы была мне заўсёды вельмі блізкая. Нейкі час мы хацелі быць разведчыкамі, потым — лётчыкамі, абмяркоўвалі тэму космасу. Я думаю, што гэта быў дзіцячы, падлеткавы час, калі сэрца гарэла жаданнем здзейсніць подзвіг для Радзімы, народа... Выходзячы з гэтай установкі, выпрацоўваліся крытэрыі сістэмы каштоўнасцяў у жыцці.

***— А што вы памятаеце пра студэнцтва?***

— Прыгадваю свае студэнцкія гады ў семінарыі, акадэміі... Я чуў ад многіх людзей старэйшага пакалення, якія былі сведкамі разбурэння храмаў, як яны казалі: маўляў, навошта аднаўляць, навошта столькі сіл укладваць? Усё роўна ўзарвуць, усё роўна зачыняць. Я сутыкаўся з такім песімістычным настроем, але ён мне не перадаўся. Займаючыся захаваннем старажытнасцяў, ты ўключаешся ў гісторыю, але не тэарэтычную, а практычную. Калі ты даведваешся гісторыю Успенскага сабора Троіца-Сергіеўскай лаўры, то разумееш, што яна сумная. Пётр I там маліўся, Дзмітрый Данской там маліўся... Гэтая тэма табе становіцца вельмі зразумелай і блізкай. Затым ты падступаеш да дойлідства, іканапісу... Нейкія ювелірныя вырабы... Вывучаючы гісторыю Троіца-Сергіеўскай лаўры, ты акунаешся ў гісторыю ўсёй Расіі. І ты разумееш, што тое, чым ты займаешся, — гэта працяг сувязі часоў. Гэта напаўняе тваю душу вельмі вялікім духоўным сузіраннем.

***— Вы адзін з тых, хто мае дачыненне да аднаўлення манастыроў, храмаў...***

— Вось такі прыклад, як Дудзін манастыр... Уяўляеце, яму больш за шэсцьсот гадоў! Вось колькі стагоддзяў там здзяйснялася малітва... Там зямля ўжо прасякнута святасцю. І адраджаючы такія старажытныя святыні, мы ажыццяўляем сувязь паміж небам і зямлёй. І я бачу, колькі нават да гэтых руін цягнецца моладзі, дзяцей, дарослых. І людзі вельмі часта знаходзяць такія месцы, сваю дарогу да Бога.

**Бог даў чалавеку звод законаў, правілы паводзін, правілы жыцця, жывучы па якіх чалавек будзе ладзіць свой дабрабыт і на зямлі і на небе. А сучасная цывілізацыя ўсё больш ідзе па шляху адмовы ад гэтых запаведзяў, ад гэтага зводу правілаў жыцця.**

***— Гавораць пра канец свету, апакаліпсіс... Што вы думаеце наконт гэтага?***

— Пра гэта памятаць трэба, але захапляцца нельга. Справа ў тым, што ў Святым Пісанні ў «Апакаліпсісе» сказана, што нават анёлы не ведаюць даты канца свету. Прыкметы яго будуць нам паказаны. І, перш за ўсё, святыя айцы кажуць, гэтыя прыкметы з'явяцца, калі маральнасць і духоўнасць у людзей пачне знікаць. Бог даў чалавеку звод законаў, правілы паводзін, правілы жыцця, жывучы па якіх чалавек будзе ладзіць свой дабрабыт і на зямлі і на небе. А сучасная цывілізацыя ўсё больш ідзе па шляху адмовы ад гэтых запаведзяў, ад гэтага зводу правілаў жыцця. І мы пішам іншыя правілы, якія царква называе багаборніцкімі. Таму ўсё залежыць ад нас з вамі — наблізіць канец свету або яго аддаліць.

***— Што вы думаеце пра сучаснае жыццё?***

— Часта, ацэньваючы яго, магу мець нейкія заўвагі да свецкага ладу жыцця — у душы. Але публічна імкнуся іх не выказваць. Я сябе спыняю. «Скажы, брат Георгій, а ў тваім служэнні ў цябе ўсё добра, у цябе ўсё пабудавана?» Высвятляецца, што не. Не хапае кадраў, не хапае храмаў, не хапае матэрыяльных сродкаў, можа быць, не хапае вопыту ці старання. І я сабе кажу: «У тваёй дзейнасці ёсць шмат месца для ўдасканалення. Таму ты ўжо больш глядзі на сваю паслухмянасць, на сваё служэнне». І вось, калі ты так сябе настройваеш, то ў тваёй душы з'яўляюцца святло і пакора.

***— Ва ўсіх розная формула поспеху, а як бы вы яе вызначылі?***

— Я б сказаў коратка. Гэта любоў. Любоў па-старажытнахрысціянску — гэта трываць доўга, не зайздросціць, не раздражняцца, не радавацца з няпраўды, а разам цешыцца з ісціны. У чым сэнс, калі на сучасную мову перакласці? Любоў прадугледжвае спачуванне і служэнне, а гасподзь у Святым Пісанні сказаў: «Бог ганарлівым пярэчыць, а пакорным дае міласць». І каб атрымаць гэтую ласку, чалавек павінен ісці па шляху служэння. Бо, пагадзіцеся, мы ўсе хочам, каб у нашых сэрцах былі мір, дабрыня і спакой.

**Надзея ГАЎРЫЛЕНКА,**
**вучаніца 11 класа**
**сярэдняй школы № 6**
**г. Жлобіна.**

### ПРА АЎТАРА

Надзеі нядаўна споўнілася 17 гадоў. Пра сябе яна гаворыць наступнае: «Пакольку я захапляюся гісторыяй і краязнаўствам, не раз пісала навуковыя работы. Мяне прываблівае гэты занятак тым, што, маючы зносіны з людзьмі, спазнаючы іх лёс, я знаходжу нешта новае для сябе. Мне неабыякавыя гісторыя майго горада, лёсы людзей, таму ў сваіх работах я стараюся расказаць пра гераічныя подзвігі маіх землякоў, пра іх уклад у развіццё Жлобіншчыны. Выпадковыя сустрэчы ў маім жыцці заўсёды шмат значылі і многаму навучылі. Для мяне гэта бясцэнны вопыт».

Яшчэ Надзея, як і многія дзяўчаты яе ўзросту, вельмі любіць бавіць час за чытаннем кніг. «Разам з сябрамі мы ўдзельнічаем у гульнях КВЗ. Гумар дастаўляе мне каласальнае задавальненне. За жартамі я забываю аб праблемах, магу адпачыць душой. Я веру ў тое, што смех падаўжае жыццё. Гэтак жа як і спорт, да якога я таксама не магу стаўвіцца абыякава».

Сваю будучыню Надзея хацела б звязаць з гісторыяй. «Гісторыя — гэта нешта неверагоднае, яна захапляе! Я ўпэўнена, што за сваё жыццё зраблю шмат розных рэчаў, якімі будуць ганарыцца мае дзеці!»